**УДК 373.31**

# РЭАЛІЗАЦЫЯ ВАРЫЯНТУ «НАВУЧАННЕ Ў КАМАНДЗЕ» ТЭХНАЛОГІІ НАВУЧАННЯ Ў СУПРАЦОЎНІЦТВЕ НА ЎРОКАХ ПАЗАКЛАСНАГА ЧЫТАННЯ Ў ІІ КЛАСЕ

**Мурашка Наталля Уладзіміраўна**
Магістр, настаўнік пачатковых класаў ДУА «СШ № 196 г. Мінска»
**Шылава Алена Савельеўна**
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі
БДПУ ім. М. Танка,
Мінск, Рэспубліка Беларусь

***Анатацыя:*** *праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў I–IV класаў на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі выклікае неабходнасць разумення яе сутнасці для пошуку і ўкаранення новых падыходаў, якія б спрыялі эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечвалі дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці.*

***Ключавыя словы:*** *маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя, тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве, варыянт «Навучанне ў камандзе».*

Фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на ўроках пазакласнага чытання ў ІІ класе патрабуе ад настаўніка вырашенне такіх задач, як развіццё вобразнага ўяўлення, развіццё маўленчай актыўнасці, развіццё здольнасці да літаратурнай творчасці на падставе ўспрынятых твораў мастацкай літаратуры, фарміраванне агульнавучэбных уменняў працы з тэкставай інфармацыяй розных відаў [1, с. 17].

Для вырашэння гэтых задач мы прапануем настаўнікам выкарыстоўваць тэхналогію навучання ў супрацоуніцтве на ўроках пазакласнага чытання.

Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве [2; 3] з'яўляецца альтэрнатыўнай традыцыйнаму навучанню малодшых школьнікаў на аснове атрымання гатовых ведаў і іх узнаўлення; дае магчымасць актывізаваць пазнавальную дзейнасць кожнага вучня ў адукацыйным працэсе. Галоўная ідэя навучання ў супрацоўніцтве заключаецца ў тым, што малодшыя школьнікі вучацца разам, навучаючы і дапамагаючы адзін аднаму, а не проста адначасова выконваюць прапанаванае настаўнікам заданне.

Пры выкарыстанні тэхналогіі супрацоўніцтва паралельна з засваеннем новых ведаў адбываецца фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, т.я. фарміруюцца камунікатыўныя ўменні і навыкі вучняў; развіваюцца практычныя ўменні і навыкі выкарыстання беларускай мовы ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці, таму што ўсе вучні класа вучацца разам працаваць, самастойна вучыцца, разам вырашаць любыя праблемы; падзяляць радасць поспеху пры выкананні любога задання, а таксама разам падзяляць горыч няўдачы; заўсёды быць гатовымі прыйсці на дапамогу адзін аднаму [4; 3].

Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве прадугледжвае розныя варыянты, маючы пры гэтым шырокія магчымасці навучання малодшых школьнікаў.

Разгледзім варыянт «**Навучанне ў камандзе**», які можна выкарыстоўваць на ўроку **пазакласнага чытання па тэме** «***Мы ў адказе за тых, каго прыручылі***». На папярэднім уроку пазакласнага чытання дзецям было дадзена заданне знайсці і прачытаць творы ў адпаведнасці са спіскам:

– Я. Брыль «Жыў-быў вожык»;
– А. Бутэвіч «Цікаўная котка»;
– П.Кавалёў «Жыві сабе, зайчык»;
– Я. Пархута «Снегавічок»;

– Ю. Свірка «Ласіны стажок», «Сняжок»;
– А. Ставер «Матылёк»;
– П. Ткачоў «Шэрая курачка», «Ласяня»;
– М. Янчанка «Бярозка».

**Першы этап.** Настаўнік праводзіць выставу кніг, якія трэба было прычатаць. Ён знаёміць дзяцей з кнігамі, размаўляе з дзецьмі пра аўтараў, паказвае вокладкі і ілюстрацыі. Затым настаўнік паказвае вучням карцінкі (вожыка, зайчыка, ласяня, снегавіка, кошкі), а дзеці угадавают з якіх яны твораў. Пасля гэтага дзецям прапануецца папрацаваць у камандзе.

**Другі этап.** Настаўнік размяркоўвае вучняў на групы па 4 чалавекі.

*Калі пры дзяленні на групы па 4 чалавекі, застаюцца 1, 2 або 3 вучня, то вучняў з высокім узроўнем матывацыі можна прызначыць памочнікамі настаўніка, якія, пры неабходнасці, будуць аказваць дапамогу асобным групам.*

**Трэці этап.** Настаўнік прысвойвае вучням групы нумары 1, 2, 3, 4.

У настаўніка падрыхтаваны канверты, на якіх напісаны лічбы 1, 2, 3, 4 (мал.1). Колькасць канвертаў павінна адпавядаць колькасці дзяцей у класе, а колькасць канвертаў з аднолькавым нумарам павінна адпавядаць колькасці груп.




**Малюнак 1. – Канверты, падрыхтаваныя для працы**

У кожным канверце ляжыць ліст з чатырма невялікімі заданнямі для аднаго вучня.

*Сутнасць задання ў канверце – гэта падрыхтоўка кожным вучнем вуснага паведамлення пра адзін з твораў, які яны чыталі дома. Але, паколькі вучні 2 класа павінны яшчэ навучыцца рыхтаваць свой вусны адказ, то мы ў канверт ўкладваем своеасаблівы план падрыхтоўкі вуснага паведамлення, які, па сутнасці, складаецца з 4 задач:*

– здагадацца пра які твор ідзе гаворка і назваць яго,
– назваць аўтара гэтага твора,
– падрыхтаваць невялікі расказ пра яго,
– прачытаць маленькі адрывак з яго.

*Ніжэй прыведзены прыклады заданняў. (У дужках пазначаны правільныя адказы для настаўнікаў.)*

***Заданне для канверта под нумерам 1:***

1) Выпраўце назву твора: «Цікаўная мушка». *(«Цікаўная котка».)*
2) Назавіце аўтара твора. *(А. Бутэвіч.)*
3) Падрыхтуйце 2-3 сказы пра гэты твор.
4) Прычытайце цікавы маленькі ўрывак з яго.

***Заданне для канверта под нумерам 2:***

1) Выпраўце назву твора: «Жыві сабе, пеўнік!». *(«Жыві сабе, зайчык!».)*
2) Назавіце аўтара твора. *(П. Кавалёў.)*
3) Падрыхтуйце 2-3 сказы пра гэты твор.
4) Прычытайце цікавы маленькі ўрывак з яго.
5)

***Заданне для канверта под нумерам 3:***

1) Выпраўце назву твора: «Ласіны ражок». *(«Ласіны стажок».)*
2) Назавіце аўтара твора. *(Ю. Свірка.)*
3) Падрыхтуйце 2-3 сказы пра гэты твор.
4) Прычытайце цікавы маленькі ўрывак з яго.

***Заданне для канверта под нумерам 4:***

1) Выпраўце назву твора: «Шэрая козачка». *(«Шэрая курачка».)*
2) Назавіце аўтара твора. *(П. Ткачоў.)*
3) Падрыхтуйце 2-3 сказы пра гэты твор.
4) Прычытайце цікавы маленькі ўрывак з яго.

Настаўнік размяркоўвае канверты па камандах (для адной каманды па адным канверце кожнага нумара):

– канверт пад нумарам 1 для вучняў пад нумарам адзін;
– канверт пад нумарам 2 для вучняў пад нумарам два;
– канверт пад нумарам 3 для вучняў пад нумарам тры;
– канверт пад нумарам 4 для вучняў пад нумарам чатыры.

*Пры размеркаванні канвертаў неабходна ўлічваць каму які канверт даць, таму што настаўнік заўсёды ведае пра сваіх вучняў крыху больш, чым яны самі. Неабходна зрабіць так, каб кожны вучань змог справіцца з прапанаваным заданнем, тым самым для кожнага вучня стварыць сітуацыю поспеху.*

**Чацвёрты этап.** Вучні самастойна выконваюць заданні. На яго выкананне адводзіцца пэўны час.

**Пяты этап**. Кожны ўдзельнік групы па чарзе спачатку паўтарае сваё заданне, а потым дае свой адказ на заданне, а астатнія вучні яго кантралююць. Калі вучань адчувае цяжкасці ў выкананні задання, удзельнікі групы прыходзяць яму на дапамогу.

**Шосты этап.** Кожная група прадстаўляе вынікі сваёй працы.

***Настаўнік:*** Усе групы выканалі заданні?

***Вучні:*** Так!

***Настаўнік:*** У такім выпадку пачынае сваё выступленне група №1. Нагадваю, што кожны з удзельнікаў прадстаўляе спачатку сваё заданне, а потым адказ на яго. А ўсе астатнія павінны ўважліва слухаць і не перабіваць.

***Выступае першая група.***

***Вучань 1:*** Мне трэба было выправіць назву твора, назваць аўтара твора, падрыхтаваць 2-3 сказы пра твор і прычытаць урывак з яго.

Твор называецца «Цікаўная котка». Яго аўтар Анатоль Бутэвіч. У творы расказваецца пра котку Рыску і яе гастадыню Надзейку. Котка была вельмі цікаўная і заўсёды што-небудзь тварыла.

*Чытае ўрывак:* «…Бывала, залезе на стол, абнюхае ўвесь посуд і незнарок сапхне кубачак. А сама схаваецца пад каналу ці то ад шуму, ці то ад страху, каб не пакаралі» [5].

***Вучань 2:*** Мне трэба было выправіць назву твора, назваць аўтара твора, падрыхтаваць 2-3 сказы пра твор і прычытаць урывак з яго.

Твор называецца «Жыві сабе, зайчык!». Яго аўтар П. Кавалёў. У творы расказваецца пра зайчыка, якога знайшоў у лесе пастух. У зайчыка былі хворыя заднія лапкі. Алесь і Надзейка прыглядалі за ім, а потым выпусцілі на волю.

*Чытае ўрывак:* «… Потым падышоў бліжэй да мяне, ласкава крануў за плячо і спытаў:

– Можа, выпусцім?

– Давайце, пакуль Надзейка спіць, менш слёз будзе, — згадзіўся я.

І выпусцілі мы зайчыка ў агарод… З якой радасцю пабег ён, толькі – кульгець-кульгець...

Жыві сабе, зайчык!» [6].

***Вучань 3:*** Мне трэба было выправіць назву твора, назваць аўтара твора, падрыхтаваць 2-3 сказы пра твор і прычытаць урывак з яго.

Твор называецца «Ласіны стажок». Яго аўтар Юрась Свірка. У творы расказваецца пра стажок, які быў скіданы летам. Да яго ноччу прыходзілі пачаставацца і пагрэцца лосі.

*Чытае ўрывак:* «… Следвядзе шырокім логам
Да сцвалоў старых асін.
Там стаяць, узняўшы рогі,
Асцярожныя ласі» [7].

***Вучань 4:*** Мне трэба было выправіць назву твора, назваць аўтара твора, падрыхтаваць 2-3 сказы пра твор і прычытаць урывак з яго.

Твор называецца «Шэрая курачка». Яго аўтар Павел Ткачоў. У творы расказваецца пра кураня, якое вылупілася з яйка. Гэта яйка Ніна схавала ад бабулі ў валёнак за печкай. Яна ніяк не чакала, что з яйка вылупіцца кураня.

*Чытае ўрывак:* «… Дастала валёнкі. У адным пуста. Глянула ў другі, а ў ім… маленькае жоўтае куранятка.

– Бабуля! Бабуля! – закрычала Ніна. Глянь!.. У валёнку кураня!

Глянула бабуля ў валёнак і за галаву схапілася:

– А бацюхны мае! Адкуль яно ўзялося? Тут Ніна ўсё і расказала бабулі» [8].

Пасля выступлення ўсіх груп можна з класам выбраць групу, якая лепш за ўсіх падрыхтавалась, ці групу, у адказах якой было менш за ўсіх моўных памылак, альбо групу, у якой быў найбольш поўны адказ.

Выкарыстанне варыянту «***Навучанне ў камандзе***» тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве на ўроках пазакласнага чытання дазваляе настаўніку праверыць гатоўнасць да ўроку кожнага вучня, даць магчымасць творча сябе праявіць. Акрамя таго, ствараецца сітуацыя поспеху для кожнага вучня і ў дзяцей з'яўляецца матывацыя да чытання кніг.

Выкарыстанне «***Навучання ў камандзе***» дапамагае настаўніку зрабіць працэс абагульнення існуючых ведаў больш эфектыўным, і стварыць ўмовы для развіцця маўленчай дзейнасці кожнага вучня. Акрамя таго, праца па дадзенай тэхналогіі развівае навыкі зносін і камунікацыі, што ў выніку спрыяе фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў вучняў.

## СПІС ВЫКАРАСТАНЫХ КРЫНІЦ:

1. Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания: 2 класс / Министерство образования Республики Беларусь. – Минск : Нац. ин-т образования, 2017. – 195 с.
2. Полат, Е. С. Личностно ориентированные технологии обучения // Новые педагогические информационные технологии в системе образования : учеб. пособие для студ. пед. вузов и системы повыш. квалиф. пед. кадров / Е. С. Полат, М. Ю. Бухаркина, М. В. Моисеева, А. Е. Петров; под ред. Е. С. Полат. – М. : Изд центр «Академия», 2000. – С. 203-247.
3. Казимирская, И. И. Обучение в сотрудничестве / И. И. Казимирская, А. В. Торхова //Организация и стимулирование самостоятельной работы студентов по педагогике : учеб. пособие. – Мн. : Бестпринт, 2004. – С. 234–281.
4. Мурашка, Н. У. Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве на ўроках беларускай мовы ў 1 класе як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў / Н. У. Мурашка, А. С. Шылова // Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа. – 2020. – № 8. – С. 25–29.
5. Бутэвіч, А. Цікаўная котка [Электронный ресурс] / Karotkizmest.by Беларуская літаратура // А. Бутэвіч. – Режим доступа: https://karotkizmest.by. – Дата доступа: 07.03.2020.
6. Кавалёў, П. Жыві сабе, зайчык! [Электронный ресурс] / Urok.shkola.of.by Читаем детям // П. Кавалёў. – Режим доступа: http://www.urok.shkola.of.by. – Дата доступа: 07.03.2020.
7. Свірка, Ю. Ласіны стажок [Электронный ресурс] / Urok.shkola.of.by Читаем детям // Ю. Свірка. – Режим доступа: http://www.urok.shkola.of.by. – Дата доступа: 07.03.2020.
8. Ткачоў, П. Шэрая курачка [Электронный ресурс] / Urok.shkola.of.by Читаем детям // П. Ткачоў. – Режим доступа: http://www.urok.shkola.of.by. – Дата доступа: 07.03.2020.